■ ПАДЗЕІ

# ШКОЛЬНЫ МУЗЕЙ: дзесяць год тут захоўваюць гісторыю і выхоўваюць патрыятызм

**Напэўна, няшмат між нас знойдзецца людзей, якія хоць раз у жыцці не наведалі б музей. Тым больш што і ў нашым раёне багата ўстаноў, дзе захоўваецца памяць пра мінулае і адчуваецца бесперапынная сувязь часоў. На гэтым тыдні адна з іх адзначыла юбілей: роўна 10 гадоў таму назад пачаў дзейнічаць музей воінаў-інтэрнацыяналістаў у Браслаўскай сярэдняй школе № 1 імя А. М. Жданава.**

Музей ваенна-гістарычнага профілю, размешчаны ў асобным пакоі, адкрыўся ў дзень 25-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана – 15 лютага 2014 г. – і быў прысвечаны баявым будням мясцовых хлопцаў, што праходзілі ваенную службу ў далёкай краіне. Ён стаў вынікам сумеснай працы навучэнцаў і педагогаў з удзельнікамі раённага грамадскага аб'яднання воінаў-інтэрнацыяналістаў. У тым ліку тагачасны дырэктар школы Тамара Стома і старшыня аб'яднання Леанід Мікшта прыклалі шмат намаганняў, каб за прадметамі экспазіцый, за фотаздымкамі альбо дакументамі наведвальнікі бачылі канкрэтных людзей, якія жылі і жывуць на Браслаўшчыне. І першапачатковая задумка аформіць некалькі інфармацыйных стэндаў для ўвекавечання вернасці нашых землякоў воінскаму абавязку з часам увасобілася ў стварэнне паўнавартаснага музея.



**Самыя дапытлівыя наведвальнікі – навучэнцы з розных устаноў адукацыі. Кіраўнік музея Таццяна Пашкоўская заўсёды падрабязна адказвае на іх пытанні.**

– Штогод нашы экспазіцыі папаўняюцца новымі рэчамі, – расказвае яго кіраўнік Таццяна Пашкоўская. – Цяпер у нас 706 музейных прадметаў: у асноўным фондзе іх 608, у дапаможным – 98. Большую частку складаюць дакументы і фотаздымкі воінаў-інтэрнацыяналістаў Браслаўшчыны. Усе рэчы размеркаваны па асобных экспазіцыях – «Вайсковая форма і яе элементы», «Дакументы і фотаздымкі жыхароў Браслаўскага раёна, удзельнікаў вайны ў Афганістане», «Вайсковы рыштунак» і «Савецкія і афганскія друкаваныя выданні». Сярод найбольш каштоўных – лісты Станіслава Ставіцкага, якія ён пісаў родным з 30 сакавіка 1981 г. па май 1983 г., прыбор для абеззаражвання вады таго часу, калекцыя марак пошты Афганістана, макеты зброі і інш.

Для наведвальнікаў тут распрацавана некалькі экскурсій: аглядная ды тэматычныя – «Іслам», «Жыццё браслаўчан у 1980-я гг.», попытам карыстаюцца таксама перасоўныя «Я вяртаюся дадому», «Мірнае дзяцінства нашых бацькоў».

За гады работы музей воінаў-інтэрнацыяналістаў у СШ № 1 імя А. М. Жданава стаў сапраўдным цэнтрам грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Педагогі праводзяць у ім урокі гісторыі і мужнасці, класныя гадзіны, заняткі членаў гуртка «Юныя экскурсаводы», яго гасцямі становяцца ветэраны Вялікай Айчыннай і афганскай войнаў, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, навучэнцы і настаўнікі ўстаноў адукацыі раёна. Не спыняецца і актыўная пошукавая работа, якая дае магчымасць пастаянна папаўняць фонды школьнага музея новымі экспанатамі. А сустрэчы з былымі байцамі, запісы салдацкіх успамінаў дапамагаюць дзецям і дарослым не толькі больш даведацца пра падзеі афганскай вайны, а і па вартасці цаніць мірнае неба над галавой.

Можа падацца, што 10 гадоў для музея не надта вялікая дата, аднак гэты юбілей – важная падзея для браслаўчан, якія паважаюць гісторыю роднага краю і ганарацца сваімі землякамі. ■

**Жанна БЯЛЬКО.** *Фота аўтара.*